ПОИ
318746

# Беларуская мова 8 клас

## Дыктанты, пераказы, пераклады



Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*Пад рэдакцыяй П.А. Міхайлава*

Рэкамендавана ўстановай «Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*2-е выданне*

Мінск
«АВЕРСЭВ»
2003

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 808.26(075.3)
ББК 81.2Беи-922
Б43

***Аўтары:***

І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка

Рэцэнзенты:

канд. філал. навук, дац. каф. рыторыкі і методыкі выкладання моў і літаратур Бел. дзярж. ун-та ***І. М. Саматыя***; настаўнік бел. мовы і літ-ры СШ № 2 г. Маладзечна ***Г. Ф. Гусева***

**Беларуская мова**: Дыктанты, пераказы, пераклады:
Б43 8 клас: Дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. шк., гімназій, ліцэяў/І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка; Пад рэд. П. А. Міхайлава. — 2-е выд. — Мн.: «Аверсэв», 2003. — 224 с.
ISBN 985-478-208-5.

Дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове.

Раздзелы дапаможніка адпавядаюць асноўным навучальным тэмам праграмы агульнаадукацыйнай школы і падручнікаў для навучэнцаў 8 класа.

УДК 808.26(075.3)
ББК 81.2Беи-922

*Вучэбнае выданне*

**Бурак** Ірына Леанідаўна
**Міхайлаў** Павел Аляксандравіч
**Мытнік** Таццяна Аляксандраўна
**Чайка** Наталля Уладзіміраўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Дыктанты, пераказы, пераклады**

**8 клас**

Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*2-е выданне*

Адказны за выпуск *Дз. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 24.07.2003. Фармат 84×108 1/32.
Папера друкарская № 2. Гарнітура «Школьная». Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 11,76. Ул.-выд. арк. 7,54. Тыраж 5100 экз. Зак. 1669.
Пасведчанне № 08-33-0.156048
аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі прадукту ад 13.12.2000.
Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэв».
Ліцэнзія ЛВ № 106 ад 25.07.2002. Кантактны тэлефон (017) 210-18-98.
E-mail: info@aversev.com; www.aversev.com
Рэспубліка Беларусь, 220123, Мінск, М. Багдановіча, 129а.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.

© Калектыў аўтараў, 2002
© Афармленне. ТДА «Аверсэв», 2002

ISBN 985-478-208-5

## ПРАДМОВА

*Гэты дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове. Ён складзены ў поўнай адпаведнасці з дзеючай вучэбнай праграмай і падручнікамі па беларускай мове для 8 класа школ з рускай і беларускай мовамі навучання, а таксама з улікам «Адзінага моўнага і арфаграфічнага рэжыму школы»*.*

*Кніга складаецца з дзевяці самастойных раздзелаў: «Словазлучэнне», «Сказ», «Просты сказ: двухсастаўныя сказы», «Просты сказ: аднасастаўныя сказы», «Просты сказ: няпоўныя сказы», «Просты сказ: сказы з аднароднымі членамі», «Просты сказ: сказы са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі», «Просты сказ: сказы з адасобленымі членамі», «Спосабы перадачы чужой мовы». Гэтыя раздзелы адпавядаюць асобным навучальным тэмам і размяшчаюцца строга ў паслядоўнасці, вызначанай вучэбнай праграмай і падручнікамі для навучэнцаў 8 класа.*

*Кожны асобны раздзел змяшчае тры віды пісьмовых прац — дыктанты, пераказы і пераклады, мэтанакіравана*

---

* Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з рускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Антанюк Л. А., Бадзевіч З. І., Кныш М. К., Саматыя І. М. Беларуская мова: Сінтаксіс і пунктуацыя: Падручнік для 8 класа школ з беларускай мовай навучання. Выданне другое. — Мн., 2001.

Тамашэвіч Т. І. Беларуская мова: Падручнік для 8 класа школ з рускай мовай навучання. — Мн., 1999.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРОСТЫ СКАЗ:
## СКАЗЫ СА ЗВАРОТКАМІ, ПАБОЧНЫМІ СЛОВАМІ І ВЫКЛІЧНІКАМІ

# ДЫКТАНТЫ

## ТЛУМАЧАЛЬНЫ ДЫКТАНТ

### Прадвесне

Чырвоны певень з адмарожаным грэбнем і распухлымі «завушніцамі» вылезе праз акенца з курятніка, спусціцца па драбінках на двор, квола падымаючы то адну, то другую таксама прымарожаную нагу і, нязграбна захлопаўшы крыллем, заспявае. Затым, раз-пораз высока задзіраючы галаву, нап'ецца вады з малюпасенькай лужыны хлява і, шмаргануўшы крылом па назе, патупае бокам-бокам да курэй, якія, збіўшыся ў купку, пастануць ля хлява, на сонейку, надзяўбаўшыся з карыта халоднага цеста. У гэты час старая бабулька Наста радасна ўздыхне:

— О, дзякуй богу, вясна будзе ранняя... Кажуць жа людзі, калі на грамніцы нап'ецца певень пад страхой вадзіцы, дык на Юр'я на пашы наесца вол травіцы.

Але да вясны, вядома, яшчэ далёка. Ледзь толькі сонца зверне з поўдня, як адразу пачынае халадзець. З шыфернага даху пазвісаюць вострыя рыжаватыя ледзяшы, куры зноў пахаваюцца на куросані, а на шыбы акон зноў палезе мароз, вырысоўваючы пальмы, елкі, лісце папаратніку, казачныя кветкі і травы. (143 словы)

*Паводле В. Дайліды*



**ЗАДАННІ**

1. Знайсці пабочныя словы ў тэксце.
2. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

## ВОЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Вечар

Ужо сонца зайшло і тонкі дымок туману падняўся над лесам. У небе заблішчалі зоркі, павеяў халадок ночы. У вёсцы па хатах засвяціліся агні.

Дзень значна паменшаў, і людзі дацямна застаюцца на полі, пакуль не скончаць свае работы. Вось цяпер адны вячэраюць пасля цяжкай работы на полі, другія яшчэ канчаюць працу дня. Заскрыпеў апошні воз грэчкі. На двары, каля гумен, чуваць людскія галасы. То мужыкі кладуць на воз апошнія снапы. Цераз гадзіну ўсё сціхае. Гаснуць агні па хатах, і ў вёсцы наступае цемень і цішыня. Толькі часамі пройдуць вуліцаю два-тры вартаўнікі, курачы люлькі або папяросы і ціха гаворачы. Месяц яшчэ не ўзышоў, а ноч даўно ўжо абняла зямлю і неба. Мільёны зорак дрыжаць і мігцяць. (114 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Запісаць тэкст у вольнай форме, выкарыстоўваючы сказы з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі.
2. Падкрэсліць пабочныя і ўстаўныя канструкцыі. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

### Гарадскі пейзаж

Мінулі адзін, другі бугрысты ўзгорак, а на трэцім Федзя Салаўянчык азірнуўся. Асветлены сонцам, горад займаў увесь далягляд. Адсюль Федзя лёгка мог адрозніць заводскія будынкі ад жылых дамоў, катэджаў і чатырохпавярховага інтэрната, дзе ён жыў з сябрамі. Відаць былі і карпусы з цэхамі, у якіх яны працавалі. Стромкі комін заводскай электрастанцыі



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

высока дыміў у неба. Усё гэта здалося Федзю такім сваім, блізкім... Ці даўно ён, упершыню пад'язджаючы да горада, прыблізна з таго ж месца баязліва і насцярожана ўглядаўся на гэту раскіданую будоўлю, на гэты комін — на ўсё такое невядомае, загадкавае і таямнічае? А цяпер — цяпер аўтазавод і роднае слова, якое дзесьці там, за Крутой гарой, невымоўнымі ніцямі пачуццяў звязаліся ў адзін тугі вузел, які хаваўся недзе ў самым сэрцы. (119 слоў)

*Паводле І. Грамовіча*

**ЗАДАННЕ**

1. Запісаць тэкст у вольнай форме, выкарыстоўваючы сказы з пабочнымі словамі.

### Надыход зімы

Разагнаў вецер з неба хмары, і глядзіць яно халодна і сярдзіта. Сярдзіты вецер як нажом рэжа ў твар, забівае дух. Сонца блісне на некалькі гадзін на краі неба і зараз жа хаваецца. Чырвоныя слупы на захадзе граюць на небе халодным полымем. Гэтыя слупы значаць на вялікі мароз. Шыбы мужычых вокан замуроўваюцца марозам. Якіх толькі цацак не наклаў ён на шыбы! Белыя лапы, як дубовае лісце, густа належаць на вокнах адна на адну. Дым шырока і роўна звісае, як слуп, над комінамі і з вялікай цяжкасцю падымаецца ўгору, і там сплываецца ў цэлую белую хмару. Сані скрыпяць і пішчаць, і спяваюць песні пад дудку марозу.

Сярдуе мароз. Гуляе па даху, сціскае яго ў сваім халодным абдыманні так, што той стогне і трашчыць. Нікога не шкадуе мароз, усіх ён цісне; бегае па лесе, пераскоквае з аднаго дрэва на другое. Усё пахавалася, і ходзіць мароз адзін, нікога не баіцца, усіх пужае. (148 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННЕ**

Запісаць тэкст у вольнай форме, устаўляючы, дзе магчыма, пабочныя словы.



## ВЫБАРАЧНЫ ДЫКТАНТ

### Папярэднікі кнігі

Папіруснаму скрутку наша сённяшняя кніга абавязана тым, што там, па сутнасці, упершыню была вынайдзена старонка. На ўсіх іншых матэрыялах, скажам, на розных таблічках ці паверхнях камянёў, радкі ішлі ад краю да краю, і калі атрымлівалася наша старонка, то выпадкова. Яна паходзіла ад памеру самога матэрыялу.

Папірус жа даваў магчымасць пісаць уздоўж скрутка і мець радкі з дзесятак метраў даўжынёю. Аднак так людзі не пісалі. Бо з кожным радком як пры пісьме, так і пры чытанні трэба было б раскручваць і скручваць сувой.

Якраз у папірусным скрутку, відаць, і быў шчасліва знойдзены той памер нашай старонкі, які дазваляе нам пры чытанні вадзіць толькі вачыма ад краю да краю радка, не паварочваючы галавы. І калі часам і забаляць ад доўгага чытання вочы, то не баліць шыя... (123 словы)

*Паводле А. Клышкі*

**ЗАДАЧНІ**

1. Знайсці і выпісаць канструкцыі з пабочнымі словамі.
2. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

## ДЫКТАНТ «ПІСЬМО ПА ПАМЯЦІ»

### Рака Удава

Рэчка гэтая, як я вам ужо гаварыў, называецца Удава. Казалі старыя людзі, што існавала легенда: нібыта яна калісьці была замужам. Муж быў злы, свавольны, разбураў сенажаці, зносіў масты, змываў копы сена. І сонца высушыла яго. Стаўшы ўдавой, рэчка раззлавалася, але саўладаць з сонцам не змагла і стала помсціць людзям, жывёлам: кожны год бра-



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

ла ахвяру. І сапраўды, легенда легендай, а на гэтай рэчцы шмат людзей утапілася. Тут была глыбокая яміна, якая называлася Прыцава: там калісьці ўтапіўся малады чалавек па прозвішчы Прыц. Як ён утапіўся, ніхто не ведае. Казалі, што ішоў вечарам ад дзяўчыны з Перавоза...

Ёсць мясціна, якую называюць Янушкава яма. Там ужо пасля асушэння таксама няшчасце здарылася: утапіўся ветэрынар. Аднойчы захлынуўся нават лось. Што яго змусіла ўваліцца ў рэчку, і чаму ён не выбраўся — загадка. Так што Удава наша каварная і злая. (132 словы)

*Паводле В. Дайліды*

**ЗАДАННІ**

1. Завучыць тэкст і запісаць па памяці.
2. Знайсці ў тэксце пабочныя канструкцыі.
3. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

## ДЫКТАНТ «ПРАВЯРАЮ СЯБЕ»

### Старажытная кніга

Даўнейшая кніга была своеасаблівым творам мастацтва. Абрысы старанна выведзеных літар ткалі дзівосны ўзор радкоў. Да таго дадайце яшчэ каляровыя, размаляваныя пачатковыя літары (ініцыялы), а таксама назвы раздзелаў, розныя рубрыкі. Іх, як упаміналася ўжо, знарок выдзялялі чырвоным **колерам**. Між іншым, «рубрыка» паходзіць ад слова «чырвоны» (па-лацінску «рубэр»).

Пачатковыя літары часта рабілі ў выглядзе кветак, птушак, звяроў — гэта таксама ўпрыгожвала **кнігу**.

Раздзелы адзін ад аднаго часта адасаблялі рознымі **канцоўкамі** ці застаўкамі ў форме мудрагелістых завіткоў ці плеценага арнаменту.

З цягам часу ўсё часцей можна было сустрэць сярод тэксту і маленькія малюнкі — мініяцюры. Пазней яны займаюць нават цэлыя старонкі. Тут



чытач знаходзіў часам **партрэты** каралёў ці багацеяў, на заказ якіх гэтыя кнігі перапісваліся. Але найчасцей то былі малюнкі яшчэ дарагія і тым, што, бывае, толькі з іх мы можам найдакладней уявіць, якія, скажам, былі ў людзей тады вопратка, мэбля і іншыя рэчы, аб чым маўчаць самі тэксты. (144 словы)

*Паводле А. Клышкі*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці і падкрэсліць канструкцыі з пабочнымі словамі. Праверыць сябе.
2. Вызначыць, якімі членамі сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы.

## КАНТРОЛЬНЫ ДЫКТАНТ

### Роднае мястэчка

Дзесяць дзён прабыў Васіль у мястэчку, а ўражанне такое, што ніколі яго не пакідаў. Нібы не было трыццаці гадоў, якія жыў на чужыне, і нібы ўсё-ўсё ведае пра заасфальтаваную вуліцу, разлеглыя палі на балацянках і пні, пра пераезд, будкі пры пераездзе, у якіх жывуць зусім іншыя людзі. Відаць, многа перамен у мястэчку, але яшчэ больш такога, што Васіль да дробязей памятае і ведае. Васіль можа зрокава ўявіць усіх да аднаго гаспадароў старых, пакрыўленых хацін, якія стаяць наўзбоч забрукаванай, заасфальтаванай вуліцы, іх твары, паставы, паходку, манеру гаварыць, помніць іхнія сямейныя гісторыі, розныя выпадкі, якія з імі адбываліся. Толькі большасці гэтых людзей ужо няма на свеце.

Карані кожнага чалавека, зразумела, там, дзе ён нарадзіўся, пражыў маладыя гады. Гэтага нельга забыць, выкінуць з душы, памяці. Корні яго, Васіля, тут, у мястэчку, і, можа, таму ў кожны свой прыезд ён на дзіва лёгка і хутка асвойваецца з тутэйшым жыццём. (146 слоў)

*Паводле І. Навуменкі*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Змест

*Прадмова* ........ 3

**СЛОВАЗЛУЧЭННЕ**

ДЫКТАНТЫ ........ 7

Папераджальны дыктант ........ 7
Каменціраваны дыктант ........ 8
Творчы дыктант ........ 9
Вольны дыктант ........ 9
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 10
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 11
Выбарачныя дыктанты ........ 12
Кантрольны дыктант ........ 12

ПЕРАКАЗЫ ........ 13

ПЕРАКЛАДЫ ........ 20

Пераклад-пераказ ........ 29

**СКАЗ**

ДЫКТАНТЫ ........ 33

Папераджальныя дыктанты ........ 33
Каменціраваныя дыктанты ........ 34
Тлумачальны дыктант ........ 36
Вольны дыктант ........ 37
Дыктанты «Пісьмо па памяці» ........ 37
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 39
Выбарачны дыктант ........ 40
Кантрольныя дыктанты ........ 40

ПЕРАКАЗЫ ........ 42

ПЕРАКЛАДЫ ........ 49

Пераклад-пераказ ........ 50

**ПРОСТЫ СКАЗ: двухсастаўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ........ 53

Папераджальны дыктант ........ 53
Каменціраваны дыктант ........ 54
Тлумачальны дыктант ........ 54
Творчыя дыктанты ........ 55
Вольныя дыктанты ........ 56
Выбарачныя дыктанты ........ 60
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 61
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 62
Кантрольныя дыктанты ........ 63

ПЕРАКАЗЫ ........ 66

ПЕРАКЛАДЫ ........ 74

**ПРОСТЫ СКАЗ: аднасастаўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ........ 91

Папераджальны дыктант ........ 91
Каменціраваныя дыктанты ........ 92
Тлумачальны дыктант ........ 93
Творчы дыктант ........ 94
Вольны дыктант ........ 94
Выбарачны дыктант ........ 95
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 96
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 97
Кантрольныя дыктанты ........ 97

ПЕРАКАЗЫ ........ 99

ПЕРАКЛАДЫ ........ 107

**ПРОСТЫ СКАЗ: няпоўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ........ 109

Папераджальны дыктант ........ 109
Каменціраваны дыктант ........ 110
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 110
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 111
Кантрольныя дыктанты ........ 112

ПЕРАКАЗЫ ........ 113

ПЕРАКЛАДЫ ........ 119

**ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з аднароднымі членамі**

ДЫКТАНТЫ ........ 121

Папераджальныя дыктанты ........ 121
Каменціраваныя дыктанты ........ 123
Тлумачальны дыктант ........ 124
Творчыя дыктанты ........ 125
Вольны дыктант ........ 126
Выбарачныя дыктанты ........ 127
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 129
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 129
Кантрольныя дыктанты ........ 130

ПЕРАКАЗЫ ........ 132

ПЕРАКЛАДЫ ........ 140

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі

ДЫКТАНТЫ ........ 146
Тлумачальны дыктант ........ 146
Вольныя дыктанты ........ 147
Выбарачны дыктант ........ 149
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 149
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 150
Кантрольны дыктант ........ 151
ПЕРАКАЗЫ ........ 152
ПЕРАКЛАДЫ ........ 157

## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з адасобленымі членамі

ДЫКТАНТЫ ........ 162
Папераджальны дыктант ........ 162
Каменціраваны дыктант ........ 163
Тлумачальны дыктант ........ 164
Вольныя дыктанты ........ 164
Выбарачныя дыктанты ........ 166
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........ 167
Дыктант «Правяраю сябе» ........ 168
Кантрольныя дыктанты ........ 169
ПЕРАКАЗЫ ........ 171
ПЕРАКЛАДЫ ........ 179

## СПОСАБЫ ПЕРАДАЧЫ ЧУЖОЙ МОВЫ

ДЫКТАНТЫ ........ 192
Папераджальныя дыктанты ........ 192
Каменціраваны дыктант ........ 193
Творчы дыктант ........ 194
Вольны дыктант ........ 195
Выбарачны дыктант ........ 195
Кантрольны дыктант ........ 196
ПЕРАКАЗЫ ........ 197
ПЕРАКЛАДЫ ........ 204
Пераклады-пераказы ........ 206

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ